На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 92(674)

Серада, 26 мая 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 20000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля





Дзеючы старшыня АБСЕ заклікае беларускага прэзідэнта да дыялогу з апазіцыяй

Міністр замежных справаў Нарвегіі Кнут Волебэк, які зараз займае пасаду старшыні ў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, выступіў у заяве, у якой выказвае падтрымку дэмакратычнаму руху на Беларусі.

На думку спадара Волебэка, дэмакратычныя сілы краіны прадэманстравалі мужнасць і прыхільнасць справе дэмакратыі і законнасці, павагу да правоў чалавека, нягледзячы на вельмі цяжкія ўмовы падчас нядаўнай кампаніі па выбарах прэзідэнта, і тым самым прыцягнулі ўвагу міжнароднай грамадскасці да канстытуцыйнага крызісу ў Беларусі. У сваёй заяве дзеючы старшыня АБСЕ заклікае прэзідэнта Беларусі А.Лукашэнку да канструктыўнага дыялогу з апазіцыяй з мэтай стварэння дэмакратычных умоў і правядзення свабодных і справядлівых парламенцкіх выбараў у 2000 годзе пры абавязковай прысутнасці міжнародных назіральнікаў.

Спадар Волебэк звярнецца да прэзідэнта Беларусі з просьбай неадкладна вызваліць былога прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра. На яго думку, беларускае кіраўніцтва не дае падстаў для ўтрымання М.Чыгіра ў папярэднім зняволенні. Старшыня АБСЕ таксама заклікае беларускі ўрад прадпрыняць неабходныя захады для вышуку зніклых пры загадкавых абставінах былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі і былога старшыні Нацбанка краіны Тамары Вінніковай.

Іван МІХАЙЛАЎ, БелаПАН.

Партия коммунистов Белорусская более полутора месяцев ожидает решения о перерегистрации

Партия коммунистов Белорусская (ПКБ) более полутора месяцев ожидает решения Министерства юстиции о перерегистрации. Как сообщила секретарь ЦК ПКБ Елена Скриган, документы о перерегистрации партии были направлены в Министерство юстиции еще в конце марта. В соответствии с Положением о государственной перерегистрации партий документы должны быть рассмотрены в течение месяца. Однако официального ответа из Минюста партия до сих пор не получила.

По словам Е.Скриган, из беседы с начальником управления общественных организаций и объединений Михаилом Сухининым стало известно, что ПКБ не прошла перерегистрацию. Основанием для принятия подобного решения стало положение устава ПКБ о том, что партия является правопреемником Коммунистической партии Беларуси. Министерство считает, что ПКБ не обладает подобным правом. Однако, по словам Е.Скриган, до сих пор никакого письменного уведомления об этом в партию не поступило.

Еще одна проблема может возникнуть в случае принятия Советом министров постановления о правилах перерегистрации, согласно которому постановка на учет первичных структур будет стоить общественным организациям десять минимальных заработных плат. Как отметила секретарь ЦК ПКБ, в настоящее время партия имеет более семисот первичных структур, и в случае вступления в силу постановления у ПКБ просто не хватит средств для их постановки на учет.

Юрий ПОТЕМКИН.

В первом квартале 1999 года объем внешней торговли Беларуси был почти на треть меньше, чем в январе – марте 1998-го

Объем внешней торговли Беларуси за январь—март 1999 года составил 2 756,2 миллиона долларов США. По данным Министерства статистики и анализа, это на 31,4 процента меньше, чем за первый квартал прошлого года. Причем, если экспорт за указанный период снизился на 23,5 процента, то импорт — на 37,6 процента. Сальдо внешнеторгового баланса остается отрицательным (в размере 65,6 миллиона долларов).

По мнению экспертов, дефицит иностранной валюты, сохранение бартерных операций и неплатежи за импорт являются теми вопросами, которые должны быть решены для наступления устойчивого экономического роста. Между тем, по данным официальной статистики, доля бартерных операций в общем объеме внешней торговли продолжает расти. Так, удельный вес бартерных операций в экспорте достиг уже 36,8 процента (для сравнения: в январе—марте 1998 года он был равен 30 процентам), в импорте — 36,2 процента (против 22,8).

Основными торговыми партнерами Беларуси в январе—марте 1999 года оставались Россия (на ее долю приходилось 54,3 процента всего внешнеторгового оборота республики), Германия (8,3 процента), Украина (5,6), Польша (3,5), Латвия (2,4), Литва (2,3), Италия (2) и Китай (1,7 процента).

Сергей СНЕГИН.

В апреле 1999 года, по сравнению с мартом, средняя начисленная заработная плата рабочих и служащих в Беларуси снизилась с 35 до 33 долларов США

В апреле 1999 года реальный размер средней начисленной заработной платы рабочих и служащих в Беларуси снизился, по сравнению с мартом, на 5,7 процента — с 35 до 33 долларов США в пересчете по рыночному наличному курсу. По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, в апреле зарплата рабочих и служащих выросла на 9,9 процента — с 12.446.889 до 13.677.894 рублей. При этом рыночный курс доллара увеличился за этот месяц на 17 процентов, а официальный уровень инфляции составил 7,4 процента. Для сравнения: в апреле 1998 года средняя начисленная зарплата рабочих и служащих была эквивалентна 74 долларам, что в 2,2 раза выше нынешнего уровня.

Дмитрий ВЛАСОВ.

Надвор'е

26, 27 мая па краіне захаваецца пераменная воблачнасць. 26-га ўначы — па паўднёвым захадзе — удзень месцамі па краіне, 27-га ўначы — па ўсходзе — кароткачасовыя дажджы. Удзень — пераважна без ападкаў. Вецер заходні — 3—8 м/с. Тэмпература паветра ўначы 26-га — +6...+11, 27-га — +4...+9. Удзень — +15...+20.

Ір. І лікерыі, Ірыны, Аляксандра, Георгія, Макара, Яфіма.
К. Паўліны, Філіпа.

МАЙ
26
'99 СЕРАДА

Усход 4.51
Захад 21.23
Даўж. дня 16.32

Перш. квадра 22 мая
Захад 4.43
Усход 18.09

По мнению руководства Верховного Совета, президентские выборы показали: население Беларуси не хочет, чтобы Лукашенко оставался у власти еще два года

Итоги прошедших в мае президентских выборов и дальнейшие действия оппозиции после 20 июля — окончания срока полномочий президента Лукашенко — были обсуждены участниками расширенного заседания президиума Верховного Совета Беларуси 24 мая в Минске. Поскольку каждый из участников заседания получил экземпляр постановления Центральной комиссии по выборам президента Республики Беларусь, то председатель комиссии Виктор Гончар остановился в своем выступлении не на юридическом, а на политическом аспекте прошедшей кампании. По его мнению, именно президентские выборы дают реальную программу политических действий в рамках Конституции 1994 года, начиная с 21 июля нынешнего года, когда завершится пятилетний срок полномочий президента Лукашенко.

Что касается оценки прошедших выборов, то даже депутаты, которые высказали несколько критических замечаний по последнему этапу избирательной кампании, в частности — Владимир Нистюк и Анатолий Лебедько, в целом дали им высокую оценку. Выборы, по мнению участников заседания, подтвердили тот факт, что население Беларуси не хочет, чтобы президент Лукашенко осуществлял свои полномочия в течение еще двух лет. Они отмечали, что члены Центризбиркома, а также территориальных комиссий проделали огромную работу, за которую они заслуживают большой благодарности. В этой связи Семен Шарецкий отметил, что “обидно читать и слышать, когда кое-кто акцентирует все внимание на мелких негативных деталях кампании и не видит того огромного дела, которое совершили избирательные комиссии”.

Сейчас, по мнению участников заседания, как никогда нужно продумать все до мелочей, детали передачи власти легитимному председателю Верховного Совета 13-го созыва. С этой целью в самые ближайшие дни пройдут многочисленные консультации как в Беларуси, так и за ее пределами.

Владимир ГЛОД, БелаПАН.

Суд Ленинского района Могилева вынес частное определение в отношении главы Могилевского горисполкома Д.Сивицкого

Суд Ленинского района Могилева вынес частное определение в отношении председателя Могилевского горисполкома Дмитрия Сивицкого. Причиной этому стали нарушения, допущенные работниками горисполкома при отказе в проведении 3 апреля в Могилеве митинга и демонстрации.

17 марта в исполком поступила заявка от 110 человек о проведении акции протеста против постоянного снижения жизненного уровня трудящихся и нарушений нанимателями коллективных договоров. Предполагалось, что 3 апреля участники акции без помех автотранспорту и пешеходам пройдут от площади Ленина до Советской площади, где и должен был состояться митинг. Однако Могилевский горисполком, сославшись на то, что демонстранты помешают движению транспорта, шествие запретил.

Представители Могилевской региональной организации Свободного профсоюза, подававшие заявку в горисполком, усмотрели в отказе городских властей нарушение законодательства и обратились с жалобой в суд. Первое судебное заседание из-за неявки представителей власти было перенесено, на втором — суд подтвердил законность действий горисполкома. Поводом же для частного определения в отношении Д.Сивицкого стало то, что ответ на заявку о проведении акции был направлен лишь одному из организаторов, а не всем заявителям, как того требует закон.

Екатерина АВСЕЕНКО, БелаПАН.

Неправительственные организации Витебской области просят у властей помощи в создании Центра социальной реабилитации детей-инвалидов


Координационный совет неправительственных организаций, предоставляющих социальные услуги населению Витебщины, принял обращение к исполнительному комитету и Совету депутатов Витебска. Ссылаясь на столичный опыт создания детских адаптационно-оздоровительных центров и президентскую программу “Дети Беларуси”, авторы обращения просят у властей Витебска финансовой помощи в создании в городе центра социальной реабилитации детей-инвалидов.

Сейчас только в Витебске их проживает около шестисот. “Гуманнее, когда ребенок-инвалид воспитывается не в интернате, а в родной семье, имея при этом возможность посещать дневной адаптационный центр”, — говорится в обращении. Кстати, по расчетам председателя координационного совета Ольги Никитиной, сумма, необходимая для открытия такого центра, на несколько порядков ниже той, что истрачена городом на очередной “Славянский базар”, новый Дворец спорта и другие подобные нужды.

Евгений ГАЙ.

Громкое дело

Суд Кировского района решает в совещательной комнате судьбу Василия Старовойтова уже две недели



Вот уже две недели, начиная с 13 мая, находятся в совещательной комнате судьи Кировского района во главе с председателем райсуда Надеждой Чмарой. И на момент сдачи материала в номер дата объявления приговора еще не была назначена.

Служителям белорусской Фемиды можно только посочувствовать. Ведь по столь громкому делу, которое проходит под личным контролем главы государства, прокурор запросил минимальный срок. Адвокаты засыпали суд “миллионами” ходатайств о невозможности по состоянию здоровья нахождения под стражей 75-летнего обвиняемого. Международная общественность, в том числе и лояльная к нынешнему режиму — российская, требует освобождения такого уважаемого человека, как дважды Герой В.К.Старовойтов. Фактов, подтверждающих, что Василий Старовойтов положил в собственный карман те деньги, в хищении которых его обвиняют, в ходе судебного исследования не выявлено. А власти, как мне кажется, ждут сурового приговора. Ой как судьям тяжело находиться между двух огней!

В полнейшем неведении о состоянии здоровья обвиняемого пребывают и родственники. Его жена, Валентина Старовойтова, не сумела в день, когда Василий Старовойтов произносил последнее слово, взять у судьи разрешение на свидание и теперь не может попасть в следственный изолятор г.Бобруйска. А обращаться к суду, который находится в совещательной комнате, по закону не положено.

Надеемся, что Василий Константинович прочитает этот номер “Народной воли” и будет знать, что в Беларуси и за ее пределами о нем постоянно помнят.

Валерий ЩУКИН, правозащитник.

В течение недели в акции “Остановить террор в Беларуси!” приняли участие более 100 человек

Более 100 человек приняли участие в акции “Остановить террор в Беларуси!”, которую неделю назад объявил пресс-центр правозащитной организации Хартия'97. Напомним, что в рамках акции посетители информационного сайта пресс-центра Хартии'97 имели возможность отправить на электронный адрес или факс Администрации президента Беларуси письмо, в котором выражен протест по поводу нарушения в республике прав человека.

Как сообщает пресс-центр Хартии, около половины граждан, принявших участие в акции, — жители Беларуси, причем практически все они предпочитают не указывать свои фамилии. Высок процент участников из США и Канады. Многие отправители посланий дополнили их своими весьма резкими комментариями.

Наталья КУЛАГИНА.

Пратэст

Хіба гэта грэх — пісаць праўду?

Які ж у нас пільны старшыня Дзяржкамдруку М.Падгайны! Як вынікае з яго папярэджанняў, недзяржаўныя газеты, у тым ліку і “Народная воля”, вядуць нейкую падрыўную дзейнасць, робяць “заклік да захопу ўлады”. Дзіва ды і толькі! З якой гэта пары пісаць праўду, якой нам, грамадзянам Беларусі, так нестае, — значыць падбухторваць да захопу ўлады?! Незалежныя ж газеты займаюцца сваёй справай — пішуць аб тым, што адбываецца ў краіне, інфармуюць людзей аб розных падзеях і фактах, пра якія, зразумела, маўчаць “чэсныя” газеты, бо яны — не на карысць сённяшніх улад. Вось гэтыя ўлады і злуюцца на незалежныя СМІ, усяляк іх уціскаюць, прыдумляючы новыя і новыя спосабы закрыць рот праўдзе.

Тыя, хто адважваецца яе гаварыць, — людзі мужныя і адказныя. Я веру ім і падтрымліваю ў іх нялёгкай творчай працы.

В.САЛАГУБ, пенсіянер.
г.Маладзечна.

Михаил ПОДОЛЯК
"Пятилетка" экономических успехов Лукашенко

Прошлая неделя с ее многочисленными совещаниями “на самом верху” в очередной раз подтвердила уже усвоенную нами горькую истину. ***Президент Лукашенко абсолютно не умеет УПРАВЛЯТЬ конкретным экономическим и политическим процессом. Александр Григорьевич умеет ПРАВИТЬ, жестко и немилосердно.*** А это, как говорят в Одессе, две большие разницы. Управление подразумевает поиск и применение адекватных мер в кризисной ситуации, при необходимости бескровную смену экономических ориентиров, замену кандидатов на ключевые управленческие должности. Умение же **править** зиждется исключительно на стремлении силовым способом навязать собственную, не всегда праведную, волю.

Однако сила далеко не всегда позволяет решить проблему. Иначе к концу пятого года президентского правления на повестке дня не стояли бы те же вопросы, что и в начале его правления — низкий уровень жизни, скрытая безработица, ценовой беспредел. Хотя нет. К июню 1994 года республика уже научилась более-менее успешно решать свои экономические и социальные проблемы. Преодоление наметившегося раскола общества, а также обретение национального и суверенного самосознания позволило Беларуси выйти на новые рубежи государственного строительства. Лукашенко же все пять лет своего безраздельного царствования доказывал, что верховная воля прежде всего позволит белорусам жить счастливо. Не получилось?

Оказалось, что в мае 1999 года президент не в состоянии уволить даже собственное правительство. Просто потому, что нет желающих вместо Сергея Линга исполнять роль “лакея при хозяине”. Неблагодарная служба — платят мало, а наказывают по полной программе.

Меня не удивляет, что сам Сергей Степанович Линг провалил все что мог. Не про него это место. Несмотря на все старания отечественной статистики, ни один прогнозный показатель не достигнут. Правительство же устами одиозных вице-премьеров озвучивает преимущественно политические реляции и абсолютно не котируется на международных рынках.

По большому счету не премьер отвечает у нас за экономику, а сам президент. В начале своего президентского срока Лукашенко создал Администрацию президента, которая постепенно переоформилась из вспомогательного аппарата в сверхактивного дублера Совета министров. Затем Лукашенко воссоздает старую советскую ревизионную систему во главе с Комитетом государственного контроля. Но цены при Лукашенко всегда стремительно росли, а зарплаты также стремительно падали. Однако в этом не был виноват безликий Линг. Премьер всегда оставался на втором плане. Сам президент это настоятельно подчеркивал. Так, в минувший четверг с правительственным отчетом перед Национальным собранием выступает вице-премьер Леонид Козик. А уже в пятницу президент встречается за закрытыми дверями сразу со всеми вице-премьерами. И опять Лукашенко не интересует присутствие на этих мероприятиях Линга. Впрочем, и без подуставшего Линга, президент прямо заявил, что у него слишком много претензий к премьерским замам. Остается добавить к этому наличие Республиканского штаба по “разрешению чрезвычайных экономических ситуаций” под руководством “серого кардинала” М.Мясниковича и “ценового комитета” под управлением уже небезызвестного А.Кобякова, чтобы сказать главное — ***в стране создана исключительно репрессивная модель управления экономикой.*** И именно эта модель лишает нас возможности работать и зарабатывать. Автором же нынешнего “экономического чуда” является Лукашенко. Это следует запомнить...

SOS!



Пропала Тамара Винникова... Пропал Юрий Захаренко...
И это в конце второго тысячелетия. В центре Европы.
Хотя, кажется, за окном средневековье...
Когда, когда белорусские власти сделают заявление об отношении к исчезновению людей?!

У Мінску прайшло чарговае пікетаванне ў абарону палітзняволеных, у якім бралі ўдзел маці абвінавачваемых па “справе Мікалуцкага”

У Мінску на плошчы Якуба Коласа ў Мінску адбылося пікетаванне ў абарону правоў чалавека. Акцыя была арганізавана праваабарончым цэнтрам “Вясна-96”, у ёй узялі ўдзел маці Анатоля Гаўрылава і Рамана Радзікоўскага, якія абвінавачваюцца па ”справе Мікалуцкага", які загінуў у выніку тэрарыстычнага акта восенню 1997 года.

Маці арыштаваных лічаць, што справа іх сыноў цалкам сфальсіфікаваная, а падчас следства да іх сыноў ужывалі недазволеныя метады допытаў, дамагаючыся прызнання, у той час як рэальныя злачынцы пазбегнулі адказнасці.

Удзельнікі пікету разгарнулі стэнд з фотарэпартажамі, зробленымі падчас масавых акцый і ў залах суда, фатаграфіямі вязняў, а таксама экс-міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі і экс-кіраўніка Нацбанка Тамары Віннікавай, якія прапалі без вестак. Акрамя таго, на стэндзе быў змешчаны тэкст адкрытага ліста маці абвінавачваемых да прэзідэнтаў Беларусі, Расіі і ЗША. У лісце жанчыны выказвалі ўпэўненасць у невінаватасці сваіх сыноў і заяўлялі аб тым, што хацелі б адкрытага суда над імі. У лісце ўтрымлівалася просьба да прэзідэнтаў трох краін дапамагчы зрабіць працэс адкрытым, дапусціць на яго прадстаўнікоў грамадскасці і праваабарончых арганізацый.

Акцыя, што праходзіла ў ажыўленым месцы горада, выклікала цікавасць, падтрымку і спачуванне шматлікіх прахожых, якія выказвалі абурэнне парушэннем у Беларусі правоў чалавека.

Генадзь БАРБАРЫЧ, БелаПАН.

До конца года в Беларуси пройдет еще три театральных фестиваля

В нынешнем году фестивальная театральная афиша Беларуси выглядит несколько скромнее, нежели прошлогодняя. Кроме уже состоявшейся “Маладзечанскай сакавіцы” и намеченного на конец мая Международного фестиваля театров кукол, белорусским театрам предстоит в октябре собраться на “Белой Веже” в Бресте, и на юбилейных мероприятиях по поводу 60-летия Гомельского драмтеатра.

Как сообщил начальник управления театров Министерства культуры Вадим Допкюнас, меньшее число фестивалей в этом году, однако, вовсе не значит, что их число сокращается в принципе: просто появившиеся в 1998 Фестиваль национальной драматургии в Бобруйске и Фестиваль творческой молодежи в Гродно решено устраивать раз в два года. “Сегодня уже не министерство инициирует проведение новых фестивалей, а местные власти выходят с предложениями, которые мы стараемся поддержать”, — подчеркнул Вадим Допкюнас.

На двухтысячный год планируется еще один масштабный проект — Международный фестиваль национальных театров в Минске, который намерен организовать театр имени Янки Купалы.

Марина КУНОВСКАЯ.

Выніковыя аўкцыёны ў Салігорску, Віцебску і Ваўкавыску

Дастаткова выніковымі сталі аўкцыёны па продажы аб'ектаў камунальнай уласнасці, якія адбыліся днямі ў Салігорску, Ваўкавыску і Віцебску ў межах праекту Міжнароднай фінансавай карпарацыі (МФК) “Малая прыватызацыя ў Беларусі”.

Пяць з шасці лотаў прададзены ў ходзе 6-га гарадскога аўкцыёну ў Салігорску. Рэкордны рост пачатковай цаны быў зафіксаваны пры продажы склада гандлёвай базы. Склад быў прададзены аднаму з мясцовых недзяржаўных прадпрыемстваў за 2 млрд. 600 млн. рублёў, што ў 10 разоў вышэй за яго пачатковую цану.

У сярэднім цэны на аўкцыёне выраслі ў 6 разоў, што з'явілася наяўным прыкладам перавагі аўкцыённага продажу як спосабу папаўнення гарадскога бюджэту. Прыбытак ад аўкцыёну — 12 млрд. 510 млн. рублёў — паступіць у казну Салігорска. На другім аўкцыёне па продажы камунальнай уласнасці Ваўкавыскага раёна мясцоваму прадпрымальніку быў прададзены будынак былога ваеннага гарадка за 300 млн. рублёў. На 21-м гарадскім аўкцыёне ў Віцебску мясцовая фізічная асоба набыла дзяржмаёмасць магазіна за 1 млрд. 100 млн. рублёў.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Постфактум

Кому нужно белорусское кино?

Недавно в Минске завершился V Международный фестиваль женского кино, организованный киностудией “Татьяна”, Белорусским союзом кинематографистов и Министерством культуры Беларуси.

— Во время фестиваля надо было как можно больше представить белорусских картин, ознакомить мировую кинематографическую женскую общественность с национальной белорусской продукцией, — замечает член жюри игровых фильмов кинорежиссер Игорь Добролюбов. — Даже если бы картины белорусских авторов шли не в конкурсной фестивальной, а в информационной программе, была бы польза для развития кинематографа. Нужно заявлять о себе, говорить, что мы существуем, что в Беларуси есть молодые талантливые кинорежиссеры, которые что-то делают... Шведский институт и Гильдия кинорежиссеров России свою программу представили, а Белорусская академия искусств это дело проигнорировала...

На открытии Международного кинофестиваля (куда съехались кинематографисты из разных уголков мира) не было ни одного представителя от Министерства культуры. Почему-то не зачитывались, как это обычно бывает на такого рода мероприятиях, приветствия, телеграммы от руководителей государства или хотя бы от Министерства культуры. Правда, от последнего на закрытии фестиваля все же появился посланник и лично от себя сказал какие-то слова. Все.

Возникает вполне резонный вопрос: а кому вообще нужно белорусское кино? Мужское, женское — не важно. Кому?..

Марина КОКТЫШ.

Рубам!

Ці зможа прэзідэнт на сваю зарплату купіць унучцы цацку?

Вядома, цацку нармальную. Скажам, дзіцячы матацыкл на батарэйках. Колькі, вы думаеце, ён каштуе? 102 мільёны беларускіх рублёў.

Праўда, нягледзячы на ўсе запэўніванні Аляксандра Рыгоравіча, што ў яго няма таямніц ад свайго народа, дакладную інфармацыю аб тым, які месячны заробак у нашага прэзідэнта, здабыць не ўдалося. У прыёмнай кіраўніка дзяржавы на пытанне “Колькі зарабляе Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка?” са здзіўленнем адказалі: “Жартуеце?”.

Увогуле, справа не ў тым, за якую колькасць беларускіх “зайцоў” распісваецца кожны месяц у бухгалтарскай ведамасці Аляксандр Рыгоравіч. А ў тым, дзе і кім трэба працаваць у нашай дзяржаве, каб атрымліваць такую заработную плату, каб, між іншым, парадаваць сваё дзіця цацкай за 102 мільёны.


Хаця, што там матацыкл! Хацелася б пабачыць матулю, якая падаруе сваёй дачцэ прыгожую ляльку за 23 мільёны 970 рублёў. Ці ганарлівага бацьку, які прынясе сыну дзіцячую машыну за 38 мільёнаў 166 тысяч рублёў. Ці бабулю, якая з дзвюх пенсій купіць пяцігадоваму ўнуку айчынны дзіцячы веласіпед за 6 мільёнаў 929 тысяч рублёў.

Здзівіць сёння сваё дзіця цудоўнай цацкай — не праблема. І надзвычай прыгожыя лялькі, і амаль сапраўдныя цацачныя “Вольва” ці “Самазвалы”, і розныя канструктары, і мілыя мяккія цацкі — усё, здаецца, ёсць у магазінах (акрамя некаторых прадуктаў харчавання). Аднак кошт іх паднябесны. Нават айчынныя цацкі неймаверна дарагія. Таму большасць беларускіх дзяцей так і вырастаюць з марай купіць, калі стануць дарослымі, Барбі са сваім дамком ці непамернай велічыні мяккага дабрака-тыгра...

А можа, справа не ў цэнах, а ў тым, колькі мы зарабляем? А зарабляем, калі перавесці на нармальныя купюры, то нейкіх 30—40 долараў. Менавіта такі даход у большасці нашых людзей. А многія і палову гэтага не маюць.

Не, не да цацак...

Алена ТУРЫНА.



СЛОВА

да беларускага народа
Нацыянальнага грамадскага арганізацыйнага камітэта
"Беларусь — 2000 гадоў"

Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржаўнасці

(Працяг. Пачатак у №№ 90,91.)

2. ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ

Галоўным дасягненнем беларускай нацыі на яе гістарычным шляху з'яўляецца **уласная дзяржаўнасць**. Элементы дзяржаўнай арганізаванасці на нашай зямлі, як ужо адзначалася, складваліся ў **першым тысячагоддзі н.э.** Старажытныя племянныя саюзы паступова перараслі ў дзяржаўныя супольнасці — княствы. Найбольш буйным з іх было Полацкае.

Першае летапіснае ўпамінанне пра яго адносіцца да 980 г., у ім згадваецца князь Рагвалод, што княжыў у Полацку. **Полацкае княства было першай старажытнай беларускай дзяржавай** з усімі адпаведнымі атрыбутамі — суверэннай уладаю княжацкай дынастыі і веча, адміністрацыяй, уласным войскам, грашовай сістэмай. Полацкая княжацкая **дынастыя Рагвалодавічаў** запачаткавала радавод беларускіх князёў. У гістарычных дакументах прыгадваецца Рагнеда, дачка Рагвалода, князі Ізяслаў, Брачыслаў, Усяслаў Чарадзей. Найвышэйшай магутнасці княства дасягнула ў другой палове XI ст. пры Усяславе Чарадзеі. У гэты час у Полацку быў збудаваны велічны Сафійскі сабор, ён сімвалізаваў роўнасць Полацка з Ноўгарадам і Кіевам. Полацкае княства ахоплівала большую частку тэрыторыі сучаснай Беларусі. Яму належалі землі ўздоўж Дзвіны да Балтыйскага мора, дзе пачынаўся вядомы гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі". Гэта было важнай умовай эканамічнага і палітычнага росквіту княства.

Значнымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на тэрыторыі Беларусі ў той час былі **Тураўскае і Смаленскае княствы, потым Менскае, Гарадзенскае, Навагрудскае, Пінскае, Віцебскае, Друцкае і інш.**

У сярэдзіне XIII ст. Полацкае княства страціла сваю значнасць як цэнтр палітычнага жыцця на беларускіх землях. Падзеі, што адбываліся на пачатку XIII ст., ускладнілі далейшае развіццё нашай старажытнай дзяржавы. У 1201 г. немцамі ў вусці Дзвіны была заснавана Рыга, а праз год тут узнік ордэн мечаносцаў (Лівонскі ордэн). Усё гэта стварыла непасрэдную пагрозу для Полацка, прывяло да страты выхаду да мора, адмоўна паўплывала на эканамічнае жыццё княства.

У гэты час знешняя небяспека навісла над усімі абшарамі будучай Беларусі. З Поўначы і Захаду пагрозу неслі Лівонскі і Тэўтонскі крыжацкія ордэны, з Поўдня і Усходу — мангола-татарская орда. У такіх умовах на беларускіх землях пачынае вызначацца новы палітычны цэнтр у рэгіёне Верхняга і Сярэдняга Панямоння, дзе на той час існавалі балцкія племянныя аб'яднанні і славянскія гарады Навагародак, Гародня, Слонім, Ваўкавыск. Славянскае і балцкае насельніцтва гэтага рэгіёна ўступіла ў цесныя ўзаемасувязі.

Мірнае суіснаванне славянаў і балтаў, іх супрацоўніцтва былі важнымі прычынамі эканамічнага і культурнага росквіту рэгіёна, найперш гарадоў. Спрыяла паскоранаму развіццю выгаднае геаграфічнае становішча, што рабіла гэту тэрыторыю самай бяспечнай, да яе не даходзілі крыжакі і мангола-татары. У XIII ст. за рэгіёнам замацавалася назва Літва, яна паходзіла ад аднайменнай назвы буйнага балцкага племяні, якое жыло ў рэгіёне. Менавіта гэтая зямля і стала месцам нараджэння новай славяна-балцкай дзяржавы — **Вялікага Княства Літоўскага.**

Непасрэдным штуршком да развіцця працэсу дзяржаўтварэння стала знешняя небяспека з боку крыжакоў і мангола-татараў, якая прымусіла мясцовыя землі аб'ядноўвацца. Дзяржава будавалася вакол гарадоў, якія былі цэнтрамі гэтых зямель.

Першым крокам у збіранні земляў вакол **Навагародка**, які адразу вылучыўся **як палітычны цэнтр і першая сталіца** новай дзяржавы, стала заваёва і далучэнне да яго балцкіх і славянскіх земляў у цэнтральнай і паўночна-ўсходняй Беларусі. У 1253 г. **Міндоўг** са згоды Папы Рымскага прыняў каралеўскі тытул і стаў вялікім князем. Значных поспехаў у будаўніцтве дзяржавы дасягнуў яго сын **Войшалк.**

У Вялікім Княстве Літоўскім была прынята **славянская сістэма дзяржаўнай арганізацыі**, яна засноўвалася на беларускіх традыцыях дзяржаўнага кіравання і гарадскога ўпарадкавання. Славянская частка ВКЛ значна пераважала балцкую і была больш развітаю ў сацыяльна-эканамічным і культурным плане. Балты ў той час яшчэ нават не мелі свайго пісьменства. **Старабеларуская мова** славянскага насельніцтва **стала дзяржаўнай моваю** ВКЛ. Працягвалася славянізацыя мясцовых балтаў, якія пачалі ўжываць беларускую мову і на побытавым узроўні. Славянская перавага была канчаткова замацавана пасля далучэння да ВКЛ Полацкага княства ў 1307 г.

На пачатку XIV ст. пазіцыі ВКЛ значна ўмацаваліся. Спрыяла гэтаму палітыка забеспячэння адзінства дзяржавы, якую праводзіў вялікі князь Віцень. Пры наступных вялікіх князях **Гедыміне і Альгердзе** Вялікае Княства Літоўскае стала магутнай еўрапейскай дзяржавай. **Яго тэрыторыя распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мораў, ад Берасцейшчыны да вярхоўяў Акі.** Пераважную частку ВКЛ складалі славянскія землі, балцкія займалі толькі 1/5 частку ад усёй плошчы.

У 1323 г. князь Гедымін перанёс сталіцу з Навагародка ў **Трокі**, а потым у **Вільню**, якая засталася галоўным горадам ВКЛ да канца яго існавання. Вільня была заснавана славянамі-крывічамі, што з'явіліся на гэтых землях у VI—VII ст. н.э. У XI ст. Вільня называлася ў пасяленнях крывічоў Крывы (Крывіч) горад. У другой палове XI ст. горад стаў цэнтрам Віленскага княства, на тэрыторыі якога жылі славяне і балты. Доўгі час Вільня была сталіцай для беларусаў, тут знаходзіўся цэнтр беларускага культурнага жыцця. У кастрычніку 1939 г. Вільня была перададзена Сталіным суседняй краіне — Літве і засталася сталіцаю гэтай краіны.

Для адпору агрэсіі крыжакоў у 1385 г. ВКЛ заключыла **Крэўскую унію** (саюз) з суседняю Польшчаю. Вялікі князь ВКЛ **Ягайла** ў адпаведнасці з дамоваю ажаніўся з польскай каралеваю Ядвігай і быў абвешчаны каралём Польшчы. Так быў закладзены пачатак знакамітай у гісторыі Еўропы каралеўскай дынастыі Ягелонаў. З боку Польшчы рабіліся неаднаразовыя спробы падпарадкаваць сабе ВКЛ.

Адначасова самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага, амаль страчаную па ўмовах Крэўскай уніі, пасля працяглай барацьбы з Ягайлам аднавіў князь Вітаўт. У гады яго княжання (1392—1430) дасягнула найбольшага росквіту. У 1422 г. да ВКЛ была канчаткова далучана Жамойція (гістарычная тэрыторыя сучаснай Літвы). Вітаўт Вялікі ўстанавіў дыпламатычныя адносіны з усімі заходнееўрапейскімі краінамі, з Крымскім ханствам, Асманскай імперыяй (Турцыяй), Масковіяй. У сярэдзіне XV ст. замацавалася і сама назва дзяржавы — **Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім.**

Наступныя князі ВКЛ — **Казімір, Жыгімонт Стары, Стэфан Баторый** і інш. умацоўвалі дзяржаўнасць, але гістарычныя суседзі ўсёды былі пагрозай для Вялікага і Княства, дамагаліся яго тэрыторый.

Вялікае Княства Літоўскае было поліэтнічнай краінай. Асноўную частку яго складалі **беларусы і балты**, жылі таксама **украінцы, палякі**. У канцы XIV ст. на Беларусі з'явіліся татары, якіх запрасіў на вайсковую службу князь Вітаўт. У XVI ст. татары перайшлі на беларускую мову, пісалі на ёй свае кнігі арабскім алфавітам. У XIV ст. у ВКЛ пасяліліся **габрэі** з краінаў Заходняй Еўропы, яны хутка занялі прыкметнае месца ў этнічнай структуры, гаспадарчым і культурным жыцці краіны. На нашай зямлі ўцякалі ад пераследу ў Маскоўскай дзяржаве **стараверы**, імі быў заснаваны горад Ветка на Гомельшчыне. Усе жыхары ВКЛ з гонарам называлі сябе ліцвінамі.

Адметнай рысаю беларусаў-ліцвінаў з'яўляўся дэмакратызм, які грунтаваўся на вечавых традыцыях Полацкага княства часоў Рагвалода і Усяслава Чарадзея і развіваўся пасля далучэння да ВКЛ. Дэмакратызм праяўляўся ў пашырэнні правоў і свабоды, у развітым прававым уяўленні пра законнасць, разуменне каштоўнасці чалавечай асобы. Гэтыя прынцыпы і былі закладзены ў галоўныя заканадаўчыя акты Княства, найперш — **Статут Вялікага Княства Літоўскага**. Вядомы тры рэдакцыі **Статута: 1529, 1566, 1588**. Стваральнікам найбольш дасканалага **трэцяга Статута** быў знакаміты палітычны і дзяржаўны дзеяч сярэднявечнай Беларусі, **вялікі канцлер ВКЛ — Леў Сапега**. Трэці Статут дзейнічаў на працягу 250 гадоў, да 1840 г. Ён выкарыстоўваўся ў якасці ўзору ў другіх краінах для распрацоўкі ўласнага заканадаўства і дзеля таго быў перакладзены на расійскую, польскую, нямецкую і іншыя мовы. Статут быў **першым** у Еўропе зводам законаў, падрыхтаваным **на аснове мясцовага права.** Ён быў напісаны на зразумелай народу **беларускай мове.** Як вядома, у Еўропе ў той час многія краіны ў значнай ступені карысталіся рымскім правам, асновы якога былі выкладзены лацінскай мовай. **Усё дзяржаўнае справаводства ВКЛ вялося на беларускай мове**, аб чым яскрава сведчаць дакументы архіва Княства, які мае назву Метрыка ВКЛ. Гэты збор складае каля 600 тамоў справаводства вялікакняскай канцылярыі на беларускай, польскай і лацінскай мовах. Метрыка ВКЛ вывезена ў Расію, захоўваецца цяпер у Маскве.

Статут заклаў у нашай краіне асновы прававой дзяржавы, дзе панаваў закон, а не ўласная воля валадара. Ужо ў першым Статуце (1529 г.) прадугледжвалася, што ўсе жыхары ВКЛ павінны былі судзіцца адным гэтым правам. Паводле другога Статута (1566 г.) усе паны, шляхта, баяры, мяшчане і простыя людзі абвяшчаліся паўнапраўнымі грамадзянамі. Прадугледжвалася абмежаванне ўлады вялікага князя праз такія інстытуты дзяржаўнасці як Сойм і Рада. **Быў закладзены падзел уладаў на заканадаўчую, выканаўчую і судовую**. Статут ВКЛ быў **самым прагрэсіўным у Еўропе і заслужана лічыцца ў свеце класічным узорам заканадаўства эпохі сярэднявечча.**

Заканадаўчыя дакументы ВКЛ адлюстроўвалі сацыяльны склад грамадства. Асноўнымі сацыяльнымі катэгорыямі грамадзян ВКЛ былі сялянства, мяшчанскае саслоўе і шляхта. Кіруючую і арганізацыйную ролю ў дзяржаве выконвала шляхецкае саслоў'е. Шляхта выбірала караля, удзельнічала ў кіраўніцтве дзяржаваю, несла асноўны цяжар у справе абароны Айчыны, развівала культуру і асвету краіны. Найбольш вядомымі беларускімі шляхецкімі родамі былі Агінскія, Алелькавічы, Астрожскія, Гальшанскія, Гаштольды, Друцкія, Кішкі, Сапегі, Солтаны, Пацы, Тышкевічы, Хадкевічы, Чартарыйскія. Беларуская шляхта падтрымлівала сувязі з еўрапейскім дваранствам, удзельнічала ў рыцарскіх турнірах у Еўропе. Прадстаўнік рода Солтанаў у канцы XV ст. атрымаў бургундскі Ордэн Залатога Руна, самую высокую ўзнагароду таго часу, якая давалася толькі за вялікія заслугі, атрымаць яе марылі многія еўрапейскія дваране.

Вялікае Княства Літоўскае мела ўласную дзяржаўную сімволіку. Яна была звязана з гістарычным лёсам краіны і ўвабрала ў сабе адметнасць беларускай зямлі і яе насельніцтва. **Дзяржаўным гербам ВКЛ у 1295 г. стаў герб Наваградка і Полацка — "Пагоня"**. Узброены вершнік, які сімвалізаваў вобраз абаронцы нашай дзяржавы, спачатку ўжываўся як вайсковы. Першым "Пагоню" выкарыстаў вялікі князь Віцень. **На пачатку XVI ст. з'явілася бел-чырвона-белая харугва, якая стала правобразам нашага дзяржаўнага нацыянальнага сцяга.** Найбольш ранняя выява яе ёсць на карціне, прысвечанай бітве з маскоўскімі войскамі пад Оршаю ў 1514 г., што захоўваецца ў музеі ў Варшаве. Дзяржаўная сімволіка ВКЛ знікла разам са знікненнем самога ВКЛ. Яна была адроджана ў другой палове XIX ст. паўстанцамі Кастуся Каліноўскага. Дзяржаўнымі сімваламі "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг сталі зноў пры абвяшчэнні ў 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі, а потым у 1991 г., калі была абвешчана незалежная Рэспубліка Беларусь. Аднак у 1995 г. нашы гістарычныя сімвалы ізноў былі адменены, замест іх вернуты па сутнасці савецкія сімвалы, якія не маюць пад сабой гістарычнай глебы.

ВКЛ стварыла і сваю цвёрдую **эканамічную аснову,** мела незалежную грашовую сістэму. Галоўная роля ў эканамічным жыцці ВКЛ належала сельскай гаспадарцы. Аснову яе складалі буйныя феадальныя гаспадаркі — фальваркі, дзе вырошчваліся жыта, пшаніца, авёс, бабовыя культуры, гародніна, лён, каноплі. Развівалася паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва. Існавалі промыслы: лесахімічны (гналі дзёгаць, смалу), вытворчасць шкла, вінакурэнне, ганчарства, гарбарніцтва, мылаварэнне, будаўнічая вытворчасць, дрэваапрацоўка, апрацоўка каменя і інш. У XIV ст. у гарадах і мястэчках налічвалася каля 200 рамесніцкіх спецыяльнасцяў.

Важнае месца займаў гандаль. Праз Беларусь праходзілі асноўныя гандлёвыя шляхі, гэта ўдала скарыстоўвалася дзеля эканамічных інтарэсаў Княства. ВКЛ гандлявала сельскагаспадарчымі прадуктамі з многімі краінамі Захаду. Асноўную ролю ва ўнутраным гандлі адыгрывалі кірмашы, якія ладзіліся ў гарадах і мястэчках. З другой паловы XVIII ст. пачаўся новы перыяд у эканамічным жыцці ВКЛ. Феадальныя адносіны паступова замяняліся капіталістычнымі. Пачала развівацца таварна-грашовая сістэма, сельскагаспадарчая вытворчасць набывала таварны характар. Развівалася спецыялізацыя гаспадарак і рэгіёнаў, будаваліся мануфактуры.

У эканамічным жыцці ВКЛ шырока ўжывалася з боку дзяржавы сістэма заахвочванняў уладальнікаў ў павелічэнні эфектыўнасці іх гаспадарак, выкарыстоўваліся розныя ільготы, гнуткае падаткаабкладанне, што дапамагала пераадольваць эканамічныя заняпады, якія прыносілі войны і іншыя неспрыяльныя абставіны.

Самым распаўсюджаным тыпам паселішчаў у ВКЛ былі вёскі, але развіваліся і гарады. У XIII—XIV ст. на тэрыторыі, адпаведнай сучаснай Беларусі, было каля 40 гарадоў. У сярэдзіне XVII ст. існавала 42 гарады і 425 мястэчак. Асабліва хутка развіваліся беларускія гарады, што атрымалі Магдэбургскае права. Усталяванае там гарадское самакіраванне стварала найлепшыя ўмовы для іх жыццядзейнасці. Першай Магдэбургскае права атрымала Вільня ў 1387 г.

Гісторыя ўтварэння і фарміравання Вялікага Княства Літоўскага, выкладзеная на падставе ранейшых і апошніх навуковых даследаванняў незалежных гісторыкаў, сведчыць пра недакладнасць канцэпцыі, якая раней панавала ў гістарычнай навуцы. Сутнасць яе заключалася ў тым, што ВКЛ была нібыта створана толькі балцкімі плямёнамі, якія заваявалі абшары "ад мора да мора" і займелі такім чынам вялізную балцкую дзяржаву. Гэтая канцэпцыя была адназначна прынята артадаксальнымі гісторыкамі савецкай Беларусі, якія не праводзілі самастойных навуковых даследаванняў, а ў інтарэсах савецкай імперыі павінны былі таксама сцвярджаць, што беларусы ніколі не былі самастойным народам. Прымалася раней яна і ў Літве. Менавіта сучасная Літоўская Рэспубліка (Lietuva) выступае сёння адзінай па назве пераемніцай Вялікага Княства Літоўскага на падставе таго, што яе гістарычныя тэрыторыі ўваходзілі ў склад ВКЛ. Нашы суседзі яшчэ ў 1918 г. падчас абвяшчэння на гэтых землях незалежнай дзяржавы паклапаціліся пра адпаведную назву новай краіны, якая б сведчыла пра яе гістарычнае мінулае. Літоўская Рэспубліка ўзяла таксама за аснову свайго дзяржаўнага герба "Пагоню", яна ў нязначна змененым варыянце носіць цяпер назву "Віціс".

Стварэнне ВКЛ мела лёсаноснае значэнне ў гісторыі беларускай нацыі. Калі б не было гэтай магутнай дзяржавы, калі б не было еднасці і адвагі яе народа, калі б не было самаахвярнай адданасці нашых продкаў роднай Бацькаўшчыне, не ўстаялі б яны супраць двухсотгадовай крыжацкай экспансіі, супраць мангола-татарскай навалы, як не выстаялі перад ёю ўсходнія суседзі і на доўгія часы трапілі ў няволю. У гэтым рэгіёне Еўропы быў прыпынены наступ мангола-татарскіх ордаў на Захад, таму заходнееўрапейскія народы не зведалі жорсткасці гэтых заваёўнікаў.

Захаваліся звесткі пра пераможныя бітвы беларускіх ваяроў з мангола-татарамі. У 1362 г. войскі ВКЛ на чале з князем Альгердам разграмілі аб'яднаныя войскі трох татарскіх ханаў каля Сініх Водаў і вызвалілі украінскія землі ад мангола-татарскага прыгнёту. У 1506 г., у бітве на р. Лань пад Клецкам войскі Княства пад кіраўніцтвам Глінскага разбілі 30-тысячнае татарскае войска.

Крыжацкі наступ на нашу Бацькаўшчыну быў спынены ў 1410 г. бліскучаю перамогаю пад Грунвальдам. У Грунвальдскай бітве ўдзельнічалі аб'яднаныя ў выніку падпісання Крэўскай уніі войскі ВКЛ на чале з Вялікім князем Вітаўтам і войскі Польскага Каралеўства на чале з польскім каралём беларускага паходжання Ягайлам. Армія Тэўтонскага ордэна, мацнейшая у Еўропе, была ўшчэнт разбіта. Пяць стагоддзяў пасля Грунвальда ніводны ўзброены немец не ступаў на беларускія землі і землі нашых усходніх суседзяў.

У канцы XV ст. новая небяспека для нашай краіны паўстала на Усходзе. Вялікае Княства Літоўскае вымушана было ваяваць з Маскоўскай дзяржаваю. У 1480 г. Масковія канчаткова вызвалілася ад татара-манголаў і пачала наступ на Захад, імкнучыся захапіць суседнія беларускія землі. Маскоўскі вялікі князь Іван III прыпісваў сабе ролю збіральніка ўсіх праваслаўных зямель Усходняй Еўропы, такой палітыкі прытрымліваліся і ўсе наступныя расійскія цары.

Першая вайна паміж ВКЛ і Масковіяй разгарэлася ў **1492—1494 гг.** У выніку наша краіна страціла Вяземскае княства і другія землі.

Падчас новай вайны з Масковіяй у **1500—1503 гг.** былі спустошаны нашы землі каля Смаленска, Оршы, Мсціслава, Полацка, Віцебска. ВКЛ страціла 29 гарадоў і 70 воласцяў.

Усходнія, паўднёвыя і цэнтральныя часткі ВКЛ моцна пацярпелі ад маскоўскай экспансіі ў **1507—1508 гг.**

Вялікія страты панесла наша краіна падчас наступнай вайны з Масковіяй у **1512—1522 гг.,** калі ў 1514 г. быў захоплены Смаленск. Навалу з Усходу на некаторы час перапыніла бліскучая перамога у гэтым жа 1514 г. У бітве пад Оршай 30-тысячнае войска Вялікага Княства Літоўскага на чале з гетманам найвышэйшым Канстанцінам Астрожскім разграміла 80-тысячнае маскоўскае войска.

У **1534—1537 гг.** наша краіна перажыла чарговы наступ маскоўскіх войскаў. Былі спалены Тураў, Мазыр, Брагін і іншыя гарады.

У **1562 г.** войскі Івана IV Жахлівага спустошылі Мсціслаўшчыну, ваколіцы Шклова, Оршы, Віцебска, Магілёва, а праз год сам цар з 60-тысячным войскам аблажыў Полацк. Пад акупацыяй маскавітаў апынулася амаль уся Паўночная Беларусь. Акупанты нішчылі занятыя землі, выводзілі ў палон насельніцтва. Адметнай старонкаю гэтай вайны стала бітва на рацэ Ула 26 студзеня 1564 г., у якой войскі ВКЛ атрымалі бліскучую перамогу над маскоўскімі захопнікамі.

Агрэсія з Усходу стала галоўнай прычынай таго, што Вялікае Княства Літоўскае вымушана было аб'яднацца на канфедэратыўнай аснове з Польскім каралеўствам. У 1569 г. ў выніку падпісання **Люблінскай уніі** была створана новая канфедэратыўная дзяржава **— Рэч Паспалітая.** На жаль, у выніку гэтага аб'яднання ВКЛ страціла землі Падляшша, Валыні, Падолля і Кіеўшчыны, якія адышлі да Польшчы.

Дзяржаўнае аб'яднанне Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы стварыла ўмовы і для царкоўнай уніі. Як вядома, галоўнай рэлігіяй ВКЛ было праваслаўе, а Польскага каралеўства — каталіцызм. ВКЛ ў 1596 г. пайшло на заключэнне **Берасцейскай уніі,** якая адкрывала дарогу да аб'яднання дзвюх хрысціянскіх канфесій — праваслаўя і каталіцтва ў адну рэлігію, якая атрымала назву уніяцкай. Валадары княства імкнуліся такім чынам забяспечыць рэлігійнае адзінства нацыі. Новая рэлігія месцамі ўсталёўвалася з цяжкасцямі. Аднак у канцы XVIII ст. уніятамі былі ўжо 75% насельніцтва краіны. Адной з важных прычын шырокага распаўсюджвання ўніяцтва было выкарыстанне ў набажэнстве зразумелай народу роднай беларускай мовы. Унію скасавалі расійскія ўлады ў 1839 г. Уніяцкая царква пазней была адроджаная беларускай інтэлігенцыяй і сёння ў Беларусі дзейнічае гэтая канфесія.

Стварэнне канфедэрацыі ВКЛ і Польшчы спрыяла ўмацаванню абараназдольнасці абедзьвюх краінаў. У ліпені **1579 г.** войскі вялікага князя літоўскага і караля польскага Стэфана Баторыя вызвалілі захопленыя раней Маскоўскай дзяржавай Полацак, Веліж, Невель і інш.

У выніку новай вайны з Масковіяй **1609—1618** гг. да ВКЛ адышлі Смаленская, Чарнігаўская, Наўгарод-Северская землі.

На пачатку XVII ст. Рэч Паспалітая вяла войны са Швецыяй. У **1605 г.** яе войскі на чале з Янам Хадкевічам разбілі шведаў у Кірхгольмскай бітве, а ў **1609 г.** — пад Рыгаю.

У **1632—1634 гг.** адбывалася так званая Смаленская вайна, калі Масковія зноў спрабавала захапіць Смаленскія землі. Па Палянаўскай дамове яны засталіся ў складзе ВКЛ.

У **1648—1651 гг.** Рэчы Паспалітай давялося весці цяжкія ваенныя дзеянні на паўднёвых межах супраць паўстання украінскіх казацкіх загонаў пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, якія падтрымліваліся Масковіяй і імкнуліся захапіць усходне-паўднёвыя землі Беларусі.

Сапраўдным жудасным выпрабаваннем для нашага народа стала агрэсія маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча "Тишайшего" у **1654—1667 гг.** Трынаццаць гадоў без перадыху сціраліся з твару зямлі беларускія гарады, крэпасці, замкі, палацы, вёскі разам з насельніцтвам. Ад рук захопнікаў, голаду, холаду, эпідэмій загінула 46% насельніцтва ВКЛ, а на землях сучаснай Беларусі было знішчана **53%** жыхароў. Ніводная з суседніх з Беларуссю краінаў ніколі не перанесла такой дэмаграфічнай катастрофы. Абаронцы Бацькаўшчыны пакінулі трагічны запіс: "Да таго дайшла Айчына наша, што ратуючыся загіне".

Беларусь стала арэнаю ваенных дзеянняў і ў час Паўночнай вайны **1700—1721 гг.** паміж Расіяй і Швецыяй. Рэч Паспалітая выступала ў якасці саюзніка расійскага імператара Пятра I, які першым з ваенных "геніяў" прымяніў на Беларусі тактыку выпаленай зямлі перад наступаючым непрыяцелем. У выніку загінуў кожны трэці беларус. У час гэтай вайны быў узарваны Полацкі Сафійскі сабор.

Ваенная разруха была не адзінай небяспекай для Вялікага Княства Літоўскага. Паступова нарасталі і ўнутраныя праблемы. У канфедэрацыі з Польскай Каронай ВКЛ пераставала жыць сваім асобным жыццём, адчынілася дарога да моцнага польскага ўплыву. Польскі змест жыцця ўсё больш стаў увaходзіць у лад жыцця Беларусі і пачаў пераважаць. Найперш паланізацыі паддаліся беларускія магнаты і шляхта, многія перайшлі ў каталіцкую веру. Працэс рэлігійнага, а пасля і поўнага аддзялення беларускай эліты ад свайго народа адыграў драматычную ролю ў далейшай гісторыі нацыі. Страта для нацыянальнага жыцця найболей адукаванай часткі народа аслабіла яго жыццёвы патэнцыял. Сама беларуская мова выцяснялася з дзяржаўнага і магнацкага справаводства. У 1696 г. Канфедэратыўны Сойм Рэчы Паспалітай наогул вынес пастанову пра тое, што дзяржаўныя дакументы ў ВКЛ павінны складацца не на беларускай, а на польскай мове.

Бесперапынныя войны, эканамічны заняпад, парушэнне балансу раўнапраўнага існавання двух суб'ектаў канфедэрацыі, несупадзенне палітычных інтарэсаў Княства і Каралеўства прывялі да аслаблення канфедэратыўнай дзяржавы. У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай 1772, 1793, 1795 гг. паміж больш моцнымі на той час суседзямі — Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй, канфедэрацыя перастала існаваць. Землі Вялікага Княства Літоўскага былі гвалтоўна далучаны да Расійскай імперыі. **Дзяржаўная самастойнасць беларусаў была ўпершыню цалкам страчана на два стагоддзі.**

Лепшыя сыны беларускага народа змагаліся за аднаўленне незалежнасці сваёй Бацькаўшчыны ў шматлікіх паўстаннях, якія былі жорстка задушаны ўладамі. З дапамогай А.Суворава "просвещённая" расійская імператрыца Кацярына II утапіла ў крыві нацыянальна-вызвольнае паўстанне **1794 г. на чале з Тадэвушам Касцюшкам.** Ахвяры нашы засталіся непадлічанымі, бо былі незлічонымі.

Вайна Расіі з Напалеонам у **1812 г.** каштавала жыцця кожнаму чацвёртаму жыхару Беларусі, бо зноў зямля наша стала арэнай вядзення чужой нам вайны.

Пасля вызвольнага паўстання **1830—1831 гг.** па загадзе расійскага імператара Мікалая I пачалася жорсткая русіфікацыя краю. Беларускія землі сталі правінцыяй Расійскай імперыі — "Северо-Западным краем". Каб замірыць Северо-Западный край, насаджалася рускае чынавенства, руская школа, праваслаўная царква. Гэтая трыяда прымусіла паднявольных беларусаў змірыцца з навязанаю ім думкаю, што іх краіна нібыта добраахвотна ўвайшла у склад "брацкай Расіі".

Імператар Аляксандр II разам з генераламі-вешальнікам Мураўёвым жорстка разграмілі ў **1863—1864 гг. паўстанне шляхты, мяшчан і сялян-касінераў на чале з Кастусём Каліноўскім.** Расійскі высокапастаўлены чыноўнік-шавініст, апякун Віленскай навучальнай акругі Карнілаў выказаў тады жахлівую думку: рускія школы і адукацыя могуць зрабіць на Беларусі тое, што не зробяць салдаты штыкам і куляй. Прароцтва было блізкае да здзяйснення.

Новыя ўлады падпарадкоўвалі сваім інтарэсам і эканамічны патэнцыял нашых зямель, стваралі гаспадарчую апору для расійскага панавання. Расійскія цары шчодра раздавалі сваім генералам і чыноўнікам беларускія землі разам з сялянамі. Усяго было падаравана каля 210 тыс. беларускіх сялян мужчынскага полу. Канфіскоўваліся маёнткі беларускай шляхты, якая не жадала служыць расійскім уладам. Была ўведзена і расійская сістэма падаткаў, яна аказалася значна цяжэйшай і не стымулявала развіццё гаспадаркі. У выніку такой драпежніцкай палітыкі гаспадарцы беларускіх зямель былі нанесены непапраўныя страты. Нашы землі зведалі на сабе ўсе праблемы эканамічнага жыцця, якія перажывала Расійская імперыя ў XIX ст. — крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу, развіццё па расійскім узоры капіталістычных адносінаў, эканамічныя крызісы і масавае збядненне насельніцтва. Беларускія землі ператварыліся ў глыбокую правінцыю вялікай імперыі, якая не клапацілася пра іх належны эканамічны стан. Развіццё прамысловасці, будаўніцтва чыгункі, пераход ад ручной да машыннай вытворчасці не маглі істотна палепшыць цяжкага эканамічнага становішча насельніцтва. Нашы суродзічы вымушаны былі пакідаць Бацькаўшчыну і шукаць магчымасці зарабіць кавалак хлеба на чужыне. 500 тыс. беларускіх сялян ад'ехалі ў канцы XIX ст. у Сібір, дзе сёння жывуць яшчэ цэлыя беларускія вёскі. Насельніцтва нашага краю адчувала на сябе вялікі палітычны і культурны ўціск.

Насуперак палітыцы расійскага царызма наш народ здолеў абудзіцца да нацыянальнага жыцця. Беларускае слова загучала ў творах Яна Баршчэўскага, Яна Чачота, Вінцэнта Дуніна-Марцынкевіча, Францішака Багушэвіча і іншых прадстаўнікоў нацыянальна свядомай інтэлігенцыі. Беларусы побач з расійскімі змагарамі супроць царскага дэспатызму ўдзельнічалі ў народніцкім руху. Адзін з іх — Ігнат Грынявіцкі, родам з-пад Бабруйска, здзейсніў у 1881 г. замах на расійскага цара Аляксандра II. Паплечнікі Грынявіцкага ад імя беларускай фракцыі Народнай волі ў 1884 г. выдалі два нумары нацыянальнага часопіса "Гоман", дзе ўпершыню тэарэтычна абгрунтавалі існаванне ў Расійскай імперыі самастойнага беларускага этнаса, заявілі аб роўнасці яго з іншымі народамі, праве на ўласную дзяржаўнасць.

У канцы XIX ст. беларускі рэвалюцыйна-дэмакратычны і адраджэнцкі рух набраў сілы. Новы этап беларускага рэвалюцыйна-дэмакратычнага і адраджэнцкага руху разгарнуўся напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. Ён ахапіў даволі шырокія слаі насельніцтва. Зімою 1902—1903 гг. братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Алаізай Пашкевіч і іншымі. была створана **першая беларуская палітычная партыя — Беларуская сацыялістычная грамада.** У верасні 1906 г. у Вільні выйшла першая беларуская газета **"Наша доля",** якая была хутка зачынена ўладамі. Але ў лістападзе 1906 г. пачала выходзіць яе пераемніца — газета **"Наша Ніва"**. Лёс наканаваў ёй існаваць да жніўня 1915 г. і стаць сапраўднай абуджальніцай беларусаў. "Наша Ніва" згуртавала вакол сябе нацыянальныя сілы беларускага народа, падрыхтавала глебу да новага ўздыму беларускага Адраджэння. Гэты працэс быў паскораны важнымі падзеямі, што адбываліся тады ў свеце.

Першая сусветная вайна 1914—1918 гг., змаганне ў ёй Германіі і Расіі разгарнулася на беларускай зямлі. Вайна абышлася нам у **1,2 млн.** жыццяў, загінуў кожны пяты. **1,5 млн.** жыхароў Беларусі па волі расійскага самаўладства былі выгнаны са сваіх хатаў, зведалі бежанства ў глыбіні Расіі, а з ім і гора на чужыне.

Паражэнне ў вайне прывяло да краху расійскага самаўладства ў лютым 1917 г. Для нашай спакутаванай Бацькаўшчыны адкрылася перспектыва адраджэння ўласнай дзяржаўнасці.

Кульмінацыйным момантам у барацьбе за дзяржаўнасць Беларусі стаў першы **Усебеларускі кангрэс (з'езд) у Мінску ў снежні 1917г.,** арганізаваны пры вядучай ролі Беларускай сацыялістычнай грамады. У яго працы ўдзельнічалі 1872 дэлегаты з усіх рэгіёнаў Беларусі, яны прадстаўлялі сялян, рабочых, вайскоўцаў, бежанцаў, інтэлігенцыю. Кангрэс паспеў прыняць толькі першы праект пастановы пра самавызначэнне Беларусі ў складзе Расійскай Федэрацыі і часовай краёвай уладзе ў асобе Усебеларускага савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. У час прыняцця гэтага лёсаноснага для нацыі рашэння — у ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. з'езд быў разагнаны кіраўнікамі мясцовай бальшавіцкай улады пры дапамозе вайсковай сілы. Але абраныя Рада і Выканаўчы камітэт прадоўжылі дзейнасць і сталі адзінымі абаронцамі інтарэсаў беларускага народа. У лютым-сакавіку 1918 г. Рада была пераўтворана ў парламент — Раду Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), Выканаўчы камітэт стаў урадам БНР пад назвай Народны сакратарыят. **25 сакавіка 1918 г. Рада БНР выдала 3-ю Устаўную грамату, Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай дзяржаваю.** У гэтым дзяржаўным Акце гаварылася аб тым, што БНР "павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае колькасную перавагу беларускі народ", згадваліся землі Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны, Віленшчыны, Беласточчыны. Дата абвяшчэння БНР назаўсёды стала гістарычнай для нашага народа і штогод адзначаецца ўсімі свядомымі беларусамі, як найвялікшае свята. Залатымі літарамі павінны быць унесены ў гісторыю Беларусі імёны дзеячаў БНР, чыя дзейнасць падрыхтавала з'яўленне Акта 25 Сакавіка: Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Варонка, Алесь Бурбіс, Аркадзь Смоліч, Кастусь Езавітаў і многія іншыя. Раду БНР у розныя часы ўзначальвалі Іван Серада, Пётр Крэчэўскі, Васіль Захарка, Мікола Абрамчык, Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Язэп Сажыч. Зараз Старшынёй Рады БНР з'яўляецца Івонка Сурвіла, якая жыве ў Канадзе.

Замацаваць беларускую незалежнасць у той час не ўдалося. З Усходу на Беларусь наступала Чырвоная армія, з захаду — польскія войскі. Большая частка Беларусі аказалася захопленаю расійскімі бальшавікамі. Рада БНР мусіла была выехаць з Мінску ў Гародню, а потым у эміграцыю — спачатку ў Літву, а далей з 1923 па 1943 г. яна знаходзілася ў Празе, пасля ў Парыжы, ЗША, Канадзе. Увесь гэты час Рада БНР у замежжы перахоўвала ідэю незалежнасці Беларусі.

Ліквідацыя БНР бальшавікамі выклікала супраціўленне з боку беларускага народу. У абарону БНР восенню 1920 г. выступілі **Слуцкія паўстанцы,** змаганне якіх стала гераічнай старонкай гісторыі Беларусі. Імёны іх таксама нельга забываць — Уладзімір Пракулевіч, Ахрэм Гаўрыловіч, Павел Жаўрыд, Антон Сокал-Кутылоўскі, Юрка Лістапад.

Перамога бальшавікоў не магла зліквідаваць уплыў БНР на далейшае развіццё Беларусі. Новыя ўлады вымушаны былі лічыцца з беларускім нацыянальным рухам, асабліва з той яго часткаю, якая падтрымала савецкую ўладу з надзеяю на ажыццяўленне ідэалаў беларускага нацыянальнага Адраджэння. Менавіта ў выніку намаганняў беларускіх дзеячаў Аляксандра Чарвякова, Зміцера Жылуновіча, Усевалада Ігнатоўскага і іншых, **1 студзеня 1919 г. у Смаленску была абвешчана Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь,** у далейшым яна стала Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай (БССР). У 1922 г. БССР выступіла адным з сузаснавальнікаў СССР. Рэспубліка ўключала этнічныя беларускія землі, але ў далейшым не па сваёй волі страціла шмат сваіх тэрыторый.

Нашу Бацькаўшчыну дзялілі ў сакавіку 1918 г. пры падпісанні Берасцейскай дамовы паміж Расіяй і Германіяй, дзялілі ў 1920 г. пры падпісанні дамоваў Расіі з Літвою і Латвіяй. Сапраўднай драмай для беларускага народа сталіся вынікі Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. паміж Расіяй і Польшчай, у выніку якога Заходняя Беларусь была перададзена Польшчы. Аднавіць цэласнасць краіны ўдалося часткова ў верасні 1939 г., калі Заходняя Беларусь ізноў была далучана да СССР.

Глыбокай павагі заслугоўваюць нашы землякі з Заходняй Беларусі — барацьбіты за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за беларускую мову, школу і культуру: Браніслаў Тарашкевіч, Антон Луцкевіч, Адам Станкевіч, Ігнат Дварчанін, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Аляксандр Уласаў, удзельнікі беларускага нацыянальнага руху ў Вільні і іншых. мясцінах Беларусі. Многія з іх цярпелі пакуты ў польскіх турмах і канцлагерах, некаторыя пасля вызвалення ў 1939 г. ад палякаў адразу трапілі ў савецкія турмы. Трагедыю цэлага пакалення мужных, загартаваных, самаадданых і жорстка падманутых беларускіх нацыянальных дзеячаў цяжка ўявіць.

Не было шчаслівым жыццё нашага народа і ў савецкай частцы Беларусі, што знаходзілася ў складзе Савецкага Саюза. Надзея на лепшае жыццё існавала хіба толькі ў 20-я гады, што ўвайшлі ў гісторыю, як **перыяд беларусізацыі.** У гэтае дзесяцігоддзе было зроблена нямала для далейшага развіцця нацыянальнай культуры. Беларускім адраджэнцам 20-х гадоў удалося дабіцца дзяржаўнасці беларускай мовы, стварэння нацыянальнай школы, нацыянальнага універсітэта, беларускіх выдавецтваў, газет і часопісаў, тэатраў, музеяў, архіваў. Утварыўся Інстытут Беларускай Культуры, а затым на яго базе — Беларуская акадэмія навук. У канцы 20-х гадоў у беларускіх школах навучалася да 88% дзяцей.

Аднак зусім іншыя працэсы адбываліся ў эканамічным жыцці Беларусі. Менавіта ў гэты час закладваліся асновы савецкай эканамічнай сістэмы, галоўнай сутнасцю якой станавілася цэнтралізаванае дзяржаўнае кіраўніцтва. Калектывізацыя разбурыла беларускую вёску як аснову эканамічнага патэнцыяла краіны, знішчыла рэшткі тавар-на-грашовых адносінаў, фактычна аднавіла феадальныя парадкі ў ганебнай дзяржаўна-прыгонніцкай форме. Індустрыялізацыя па-савецку не ўлічвала інтарэсаў рэспублікі і яе насельніцтва.

Таталітарны савецкі рэжым праводзіў палітыку поўнай унітарызацыі, пераўтварэння нацыянальных рэспублік у безаблічныя адміністрацыйныя адзінкі новай савецкай імперыі. Канстытуцыя СССР 1936 г. знішчыла рэшткі суверэнітэта Беларускай ССР. Распачатыя ў 30-х гадах палітычныя рэпрэсіі спынілі далейшае развіццё нацыянальнай справы ў Беларусі. **Ахвярамі рэпрэсій сталі прыкладна адзін млн. чалавек,** сярод іх дзяржаўныя і гаспадарчыя дзеячы, таленавітая беларуская інтэлігенцыя. Найбольш гаспадарлівае сялянства вынішчылі ў працэсе прымусовай калектывізацыі. У 1937—1938 гг. было загублена болей 80 беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Толькі ў адзін дзень, 29 кастрычніка 1937 г., расстралялі дзевяць беларусіх літаратараў, сярод іх Платон Галавач, Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі. Праз дзесяцігоддзі іх, як і многіх іншых, рэабілітавалі, але беларуская справа была падсечана. Цяпер нашых бязвінных пакутнікаў мы шануем на Дзяды ў Курапатах і па ўсёй Беларусі, але вярнуць нацыі яе страты немагчыма.

Пазбаўленай сваіх лепшых сыноў апынулася Беларусь перад новай страшэннай пагрозай — нашэсцем нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Спачатку верасня 1939г., калі першыя ўдары вайны прыняла на сябе разам з Польшчаю і Заходняя Беларусь, а потым — у чэрвені 1941г.

У другую сусветную вайну Беларусь зведала лёс заложніцы паміж дзвюма варожымі таталітарнымі сістэмамі — сталінскай бальшавіцкай і гітлераўскай фашысцкай. Менавіта на нашай зямлі адбывалася змаганне двух рэжымаў за новы передзел свету. Кінуты на фізічнае вынішчэнне народ Беларусі ўзняўся на абарону сваёй зямлі, самога сябе і сваёй будучыні. Абышлося нам гэта неверагодна дорага, як нікому ў свеце. **У апошняй вайне зноў загінуў кожны трэці жыхар Беларусі, знішчана болей паловы нацыянальнага багацця, край перетварыўся ў выгарышча. Было разбурана 209 гарадоў і мястэчак, спалена 9200 вёсак, з іх 628 — з жыхарамі.** Пра жудасную трагедыю часоў вайны напамінаюць сумныя званы Хатыні, Трасцянец і іншыя месцы масавага знішчэння людзей падчас нямецка-фашысцкай акупацыі.

Як адна з краінаў, што зрабілі велізарны ўклад у разгром нямецкага фашызму, Беларусь у 1945 г. стала адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Перамога над нямецкім фашызмам дасталася нам страшэннай цаною, але не прынесла жаданай волі нашаму народу. Пасля вайны працягвала на ўсю моц працаваць жудасная машына палітычных рэпрэсіяў, асабліва ў Заходняй Беларусі, дзе прымусова стваралiся калгасы, знішчалася ўсё беларускае. Частка заходніх беларусаў, дакладней, насельніцтва Беластоцкага краю, у выніку передзелу межаў ізноў трапіла ў склад суседняй Польшчы.

Працавіты, адказны, самаахвярны беларускі народ у адносна кароткі час пасля вайны адбудаваў разбураную краіну. Узняўся з руінаў Мінск, ажылі Бярэсце, Магілёў, Віцебск, Гомель, паўсталі нанова многія спаленыя вёскі. Жыццё працягвалася. Беларусь паступова станавілася эканамічна развітым рэгіёнам СССР. Тут пабудавалі заводы-гіганты машынабудавання, радыё-прамысловасці, па вытворчасці бытавой тэхнікі, угнаенняў. Прадпрыемствы высокіх тэхналогій працавалі на патрэбы ваеннага комплексу і касмічных праграм СССР. Але ўсё гэта будавалася без уліку інтарэсаў эканомікі самой рэспублікі. Стваралася не індустрыя самастойнай краіны, а своеасаблівы зборачны цэх Савецкага Саюза. Аб'ём выробленай прадукцыі быў арыентаваны на спажыванне на абшарах СССР і за яго межамі. Нездаровы перакос развіцця эканомікі і яго цяжкія наступствы для Беларусі абазначыліся пасля распаду СССР у 1991 г., калі гіганты індустрыі страцілі рынкі збыту і перетварыліся ў цяжкае ярмо на шыі нашага народа. Індустрыяльны патэнцыял краіны аказаўся не надта здольным да самастойнага існавання. Беларусь — яскравы ўзор каланіяльнай палітыкі метраполіі ў адносінах да забраных тэрыторый. Індустрыялізацыя па-савецку відаць і па экалагічных наступствах для Беларусі. Непапраўныя страты нанеслі экалагічныя бедствы ў раёне Салігорскіх шахтаў, забруджаная атмасфера вакол гігантаў нафтахіміі, Гарадзенскага "Азота", Магілёўскага лаўсанавага завода і іншых. Цераз Беларусь працягнуты лініі нафта- і газаправодаў, амаль бясплатна для нашай краіны гоняць у Еўропу на продаж расійскія прыродныя багацці. Беларусам з гэтага няшмат карысці, але затое нам пастаянна даводзіцца змагацца са шматлікімі аварыямі, што здараюцца ў сувязі з небяспечным тэхнічным станам састарэлага абсталявання.

Не меней стратаў панесла Беларусь у галіне сельскай гаспадаркі. На працавіты, безадказны беларускі народ Масквою быў навешаны яшчэ адзін цяжкі абавязак — карміць цэнтральныя рэгіёны СССР. Былі пабудаваны гіганцкія жывёлагадоўчыя комплексы, птушкафабрыкі. Цягнікамі на Усход адпраўлялі мясапрадукты, а нам заставаліся "ножкі і рожкі" ды цэлыя азёры атрутнай жыжы, што знішчала ўрадлівыя землі, забруджвала наваколле. Татальная меліярацыя на беларускім Палессі прывяла да незваротных экалагічных зменаў ва ўсёй краіне і да страты ўрадлівых земляў.

Заканамерным вынікам безадказнай палітыкі, заключным яе злавесным акордам, стала найвялікшая ў гісторыі чалавецтва ядзерная катастрофа на Чарнобыльскай АЭС 26.04.86 у суседняй Украіне. Яна прынесла Беларусі незлічоныя страты. 70% радыяцыйных ападкаў асела на нашу краіну, забруджанымі аказаліся 23% тэрыторыі, на якіх пражывала 20% насельніцтва (2,1 млн. чалавек).

Так, на жаль, найвялікшыя бедствы дасталіся гаротнай Беларусі, калі ўспомніць яшчэ і тыя самыя разбуральныя за ўсю гісторыю чалавецтва дзве сусветныя вайны, якія спусташальным валам пракаціліся па нашай зямлі. Прыходзіцца толькі здзіўляцца неўміручасці духа нашага народа.

Афіцыйная палітыка савецкай дзяржавы, скіраваная на зліццё нацый у адзіны савецкі народ прывяла да заняпаду культурных набыткаў беларусаў. Паступова ліквідаваліся беларускія школы, выцяснялася з ужытку беларуская мова, паўсюдна запанавала расійская. Беларусь несла значныя страты ў людскіх рэсурсах. Беларуская моладзь цэлымі эшалонамі вывозілася на асваенне цалінных земляў Казахстана, на лесанарыхтоўкі ў Карэлію і Комі, на будаўніцтва гідраэлектрастанцый, Байкала-Амурскай чыгуначнай магістралі, на сібірскія нафтаперапрацоўкі, выпускнікі беларускіх ВНУ накіроўваліся на працу далёка ад Радзімы. У краіну прыязджалі на пастаяннае жыхарства адстаўныя афіцэры з Расіі, многія з якіх сёння выступаюць супраць замацавання дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Забраная ў войска беларуская моладзь гінула ў Венгрыі, Егіпце, Афганістане, у ваенных канфліктах за чужыя інтарэсы ў Сярэдняй Азіі, на Каўказе, па ўсім свеце, куды сягалі інтарэсы савецкай імперыі.

Дэмакратычныя працэсы канца 80-х гадоў аднавілі надзеі беларусаў на самастойнае жыццё. **Пачало набіраць сілы новае беларускае Адраджэнне.** Створаныя грамадскія структуры ўзялі на сябе арганізацыю нацыянальнага дэмакратычнага руху. Сярод іх найбольш уплывовыя — Беларускі народны фронт, лідэрам якога стаў Зянон Пазьняк, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада на чале з Міхасём Ткачовым.

27 ліпеня 1990 г. ва ўмовах крызісу савецкай сістэмы і ў выніку змагання за незалежнасць была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. 25 жніўня 1991 г. пасля распаду СССР Дэкларацыі быў нададзены статус канстытуцыйнага закона.

19 верасня 1991 г. на сесіі Вярхоўнага Савета была зацверджана новая назва нашай самастойнай краіны — **Рэспубліка Беларусь** і адноўлена наша старадаўняя сімволіка. **У 1994 г. была прынята Канстытуцыя нашай новай дзяржавы.** Першым старшынёй Вярхоўнага Савета — асноўнага заканадаўчага органа краіны, у 1991 г. быў абраны Станіслаў Шушкевіч.

У ліпені 1993 г. у Мінску адбыўся першы ў гісторыі нашага народа Сусветны з'езд беларусаў, арганізаваны Згуртаваннем "Бацькаўшчына". На Радзіму з'ехаліся беларусы з розных краінаў свету.

У тыя гады было зроблена шмат, каб дзяржаўная самастойнасць і вольнае жыццё сталі рэальнасцю для шматпакутнага беларускага народу. Пачалі складвацца ўсе неабходныя дзяржаўныя інстытуты самастойнай краіны.

Аднак шлях да свабоды і годнага чалавечага жыцця аказаўся больш складаным, чым тады бачылася. Пакуль ён не пройдзены намі. Навязаныя народу рэферэндумы ў 1995 г., 1996 г. кардынальна змянілі накірунак развіцця краіны. **Інтэграцыйная палітыка сённяшніх уладаў Беларусі, скіраваная на аб'яднанне з іншай краінай, непазбежна прывядзе да фактычнай страты нашай дзяржаўнасці і занядбання жыццёвых інтарэсаў народа Беларусі.**

У такой сітуацыі нашаму народу неабходна абаперціся на свой драматычны гістарычны вопыт, глыбока ўсвядоміць, што ўласная дзяржаўнасць — наша найвялікшае дасягненне і самая высокая каштоўнасць.

На Зямлі жыве мноства нацыяльнасцяў і толькі каля двухсот маюць свае дзяржавы. Сярод іх на карце свету пэўнае месца займае Рэспубліка Беларусь і яе трэба берагчы кожнаму з нас. Уласная дзяржаўнасць забяспечвае найбольш спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця любой нацыі, таму ва ўсіх краінах і ва ўсе часы народы змагаліся за незалежнасць. Нашы продкі лічылі гэта найвышэйшым сваім абавязкам.

Беларуская дзяржаўнасць аплачана мільёнамі жыццяў нашых папярэднікаў. У змаганні за волю Зямля Беларусі абмыта крывёю яе лепшых сыноў. Яна шчодра палітая потам тых, хто стварыў матэрыяльныя і культурныя багацці, што ў нас ёсць сёння.

Справа гонару і святы абавязак кожнага, хто жыве ў нашай краіне, — мацаваць дзяржаўную незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны, не страціць яе, каб ізноў не апынуцца ў няволі, ад якой досыць напакутаваўся беларускі народ. Трэба жыць уласным розумам, быць гаспадарамі свайго лёсу!

(Працяг у наступным нумары.)

Заявление Председателя Совета Европейского Союза

Вступление в силу Амстердамского договора 1 мая 1999 года — больше демократии и дееспособности для Европейского Союза — важный шаг к расширению

Новый этап европейской интеграции: 1 мая 1999 года вступил в силу Амстердамский договор. После Римских договоров, Единого Европейского Акта и Маастрихтского договора Амстердамский договор теперь является основой для обеспечения в будущем дееспособности и самоутверждения Европейского Союза. Амстердамским договором закладывается первый камень в совместную политику в области юстиции, внутреннюю политику, а также дееспособную внешнюю политику и политику в области безопасности Союза. Права участия Европейского Парламента значительно расширены. Этот договор вместе с тем создает — после того как были достигнуты обе большие цели — внутренний рынок и валютный союз, важные предпосылки для расширения Европейского Союза.

Важный сигнал для граждан: борьба с безработицей на европейском уровне становится центральной задачей. В Амстердамском договоре теме безработицы посвящена отдельная глава, которая дает новые полномочия. Новая скоординированная в европейском масштабе стратегия в области занятости должна способствовать как можно более высокому уровню занятости. Уже на заседании Европейского Совета в Кельне должно быть принято решение по внесенному германским председательством Пакту о занятости.

Европейский Союз становится более дееспособным в сфере внешней политики и политики в области безопасности. Амстердамский договор дает Союзу в руки новые инструменты, которыми он может в области внешней политики быстрее принимать решения и более действенно проводить их в жизнь. Например, предусматривается, что Европейским Советом будут приниматься решения о совместной политике Союза и его государств-участников в определенных регионах в форме совместных стратегий. Их осуществление будет возможно путем принятия решения большинством голосов; до настоящего времени при каждом решении необходимо единогласие. Высокопоставленный представитель по совместной внешней политике и политике в области безопасности будет входить в состав тройки ЕС и определять лицо этой политики. Решение о том, кто возьмет на себя эту задачу, должно быть принято на заседании Европейского Совета в Кельне 3—4 июня. В любом случае это будет лицо высокого политического ранга.

Основополагающие изменения политики в области юстиции и внутренней политики, которые приносит этот договор, заключаются в обеспечении открытости границ внутри Союза и защите общего правового поля в отношениях с другими государствами. Новые полномочия укрепляют способность бороться на европейском уровне против организованной преступности и нелегальной иммиграции. Европол будет преобразован в полицейское ведомство, которое в будущем будет иметь также оперативные полномочия. С обобществлением политики в вопросах предоставления убежища, а также по отношению к иммигрантам и беженцам теперь могут быть созданы единые стандарты и расходы, связанные с приемом беженцев, могут быть в солидарности распределены на всех.

Решения Европейского Союза станут в будущем более демократичными и понятными: Амстердамский договор расширяет далее права Европейского Парламента, например, при назначении комиссии. В качестве одного из первых своих действий он должен будет рассмотреть вопрос о согласии с составом новой комиссии. Поэтому выборам в Европейский Парламент с 10 по 13 июня придается еще большее значение: каждый отдельный голос важен и оказывает влияние на принятие решений в масштабах Европы.

Амстердамский договор укрепляет также позицию Председателя комиссии и предоставляет ему своего рода полномочия для определения политического курса. Это особенно важно для предстоящей реформы методов работы и структуры комиссии.

Договор более четко регулирует также распределение компетенций между Брюсселем и государствами-участниками протоколом о субсидиарности, который имеет силу договора.

Амстердамский договор создает важные, но еще не все предпосылки, чтобы подготовить учреждения ЕС к приему центрально- и восточноевропейских соседей. Решение о плане дальнейших организационных реформ должно быть принято на заседании Европейского Совета в Кельне в июне этого года. Успешным принятием Повестки-2000 в Берлине дан старт необходимым перед расширением реформам политики ЕС, в частности совместной аграрной политики.

На Камчатке сохраняется острая нехватка топлива

На 12—20 часов в сутки отключается электроэнергия в Петропавловске-Камчатском и соседних районах области. Свет подается только в больницы и родильные дома. Все крупные предприятия полуострова, кроме хлебозаводов, остановлены. Запасов топлива на Камчатке осталось менее 20 тысяч тонн, что позволит, при максимальной экономии, поддержать энергоснабжение до начала июня.

В Казахстане сформирован блок оппозиционных партий

Он создан для участия в парламентских выборах, намеченных на конец ноября. Инициатором объединения выступила Республиканская народная партия во главе с Акежаном Кажегельдиным. Как сообщает корреспондент "Радио Свобода", в блок вошли около 12 партий и движений, в том числе коммунисты. Впервые после принятия нового избирательного законодательства парламентские выборы в Казахстане пройдут по партийным спискам.

Главная цель Литвы — вступление в НАТО

Новый премьер-министр Литвы Роландас Паксас заявил, что главными целями его правительства будет вступление в НАТО и Европейский союз, а также развитие экономических связей с Россией. Парламент Литвы утвердил назначение Паксаса главой правительства вместо ушедшего в отставку Гядиминаса Вагнорюса.

Голодовка в Казахстане

В Чимкенте на юге Казахстана 14 рабочих предприятия "Фосфор" объявили о переходе к "СУХОЙ" голодовке. В акции протеста, начавшейся три недели назад, принимают участие 25 человек. Они добиваются выплаты долгов по зарплате ЗА ТРИ ГОДА.

Церемония в рейхстаге

Уходящий в отставку президент Германии Роман Херцог призвал соотечественников быть готовыми к участию в серьезных политических и социальных реформах. "Мы можем уверенно вступить в XXI век", — заявил Херцог, выступая в Берлине на церемонии, посвященной 50-й годовщине образования Федеративной республики Германии. Он подчеркнул, что демократическое устройство и экономическая мощь современной Германии — хорошая основа для дальнейшего развития. На церемонии в здании немецкого парламента — рейхстаге — присутствовали около 2-х тысяч гостей, в том числе канцлер Германии Герхард Шредер и новоизбранный президент Иоханнес Рау.

Покушение на Шеварднадзе

Грузинские правоохранительные органы изъяли целый арсенал оружия у группы лиц, задержанных в Тбилиси по подозрению в организации особо опасных преступлений. Как сообщает корреспондент "Радио Свобода", арестованы 7 человек во главе с бывшим командующим сухопутными войсками Грузии генералом Курашвили. Они планировали захватить государственную канцелярию и убить президента Эдуарда Шеварднадзе. В радиообращении Шеварднадзе заявил, что союзники и руководители этой группировки находятся за пределами Грузии — в основном в России. Правоохранительные органы утверждают, что общее руководство операцией осуществлял Игорь Гиоргадзе — бывший глава грузинских спецслужб, скрывающийся в Сирии.

Вот так выборы

Районный суд Владивостока принял решение о расформировании городской избирательной комиссии. С иском в суд обратились депутаты Приморской краевой думы, обвинившие горизбирком в некомпетентности и неоднократном срыве выборов мэра и городской думы Владивостока. Городская избирательная комиссия официально признала несостоявшимися выборы в городскую думу, проходившие 16 мая. Новый тур голосования — 17-й по счету — намечен на 12 сентября.

Взрыв бомбы в Пакистане

По меньшей мере 12 человек погибли и 30 получили ранения в результате взрыва бомбы в Пакистане. По данным полиции, двое раненых — в критическом состоянии. Пока никто не взял на себя ответственность за теракт, совершенный в городе Даска, в приграничной провинции Пенджаб.

Лужков не будет с коммунистами

Г-н Лужков исключает возможность создания каких-либо блоков "Отечества" и КПРФ. Вице-премьер правительства Москвы Ястржембский рассказал, что об этом лидер Лужков заявил на встрече с генеральным секретарем СДПГ Оттмаром Шрайнером, которая прошла в московской мэрии "за закрытыми дверями". Вместе с тем мэр обратил внимание на то, что отказ объединяться с коммунистами "не мешает "Отечеству" поддерживать контакты с КПРФ и обмениваться с ней информацией".

Подкупали ли на импичменте?

На заседании Госдумы депутат-коммунист Виктор Минаков предложил поручить специальной парламентской комиссии по вопросам коррупции в высших эшелонах власти проверить достоверность слухов о том, что якобы некоторым депутатам платили по 30 тысяч долларов США за то, чтобы они проголосовали против импичмента или не участвовали в голосовании по вопросу об импичменте президента РФ. Без голосования спикер Селезнев поддержал это предложение, а лидер фракции НДР Владимир Рыжков заявил, что "такого рода заявления вызывают у людей презрение к Думе" и призвал коллег "уважать самих себя и воздерживаться от подобных заявлений".

Внешний долг Украины

Размер внешнего долга Украины по состоянию на 1 мая 1999 года составил 12,4 млрд. долларов, сообщил министр финансов Игорь Митюков. Но министр оптимистичен: "Цифра долга практически стабильна на протяжении последних 6—7 месяцев".

Министры транспорта встретились в Варшаве

Делегация Министерства транспорта и коммуникаций Беларуси во главе с министром Александром Лукашовым возвратилась из Варшавы, где принимала участие в 83-й сессии Совета министров Европейской конференции министров транспорта (ЕКМТ). Как сообщили в управлении внешних связей Министерства транспорта и коммуникаций, на сессию Совета министров ЕКМТ прибыли делегации 47 государств мира, в том числе ассоциированных членов, а также представители Европейского Союза, Европейской Комиссии, ООН.

Дискуссия на сессии развернулась по четырем основным блокам вопросов: проблемы и препятствия в сфере интеграции транспортных рынков; автомобильный транспорт и автодорожная безопасность; финансирование развития транспорта и транспортной инфраструктуры; транспорт и окружающая среда.

Алексей ОРЕШКО.

Стоп-кадр

